ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Беларускі ўніверсітэт

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

№ 36 (869) ● ЧАЦВЕР, 14 снежня 1972 г. ● Цана 2 кап. ● Год выдання XXVI

# АБ АТЭСТАЦЫІ СТУДЭНТАЎ

Падрыхтоўка спецыялістаў ва універсітэце цесна звязана з вырашэннем задач па камуністычнаму выхаванню. На Усесаюзным злёце студэнтаў Генеральны сакратар ЦК КПСС Л. І. Брэжнеў сказаў, што «мы не можам, не маем права забываць ленінскі заклік аб тым, каб працэс вучобы ішоў рука аб руку з працэсам камуністычнага выхавання. Гэтыя два працэсы на практыцы павінны зліваецца разам...». І далей: «Дробязей у выхаваўчай рабоце не бывае і быць не можа. Таму што тут размова ідзе аб адной з самых складаных спраў — аб фарміраванні душ і характараў, аб загартоўцы сэрцаў і розумаў будаўнікоў будучага!» На аснове арганічнага спалучэння навучання і выхавання ў адзіным працэсе забяспечваецца фарміраванне ў студэнтаў высокіх палітычных і маральных якасцей, выхаванне іх актыўнымі будаўнікамі камунізму.

На сучасным этапе камуністычнага будаўніцтва вельмі важна, каб кожны студэнт бесперапынна павышаў свае веды ў галіне грамадскіх і фундаментальных навук, актыўна ўдзельнічаў у навукова-даследчай рабоце кафедр, у грамадскім жыцці групы, курса, факультэта, універсітэта, у справах працоўнага семестра, атрымліваў навыкі арганізатарскай і грамадска-палітычнай работы з людзьмі.

З мэтай павышэння асабістай адказнасці кожнага студэнта за паспяховасць, удзелу ў грамадскай і навукова-даследчай рабоце, а таксама далейшага павышэння ролі грамадскіх арганізацый і кафедр у вучэбна-выхаваўчай рабоце рашэннем рэктарата, пачынаючы з 1973 года, уведзена атэстацыя студэнтаў універсітэта.

Атэстацыя будзе кожны год праводзіцца ў верасні-кастрычніку камісіяй, зацверджанай распараджэннем дэкана факультэта. У састаў камісіі ўваходзяць: загадчык выпускаючай кафедры — старшыня (на малодшых курсах старшынёй камісіі можа быць адзін з загадчыкаў кафедры па назначэнню дэкана факультэта); прадстаўнік дэканата, партбюро, куратар групы, прадстаўнікі камсамольскай і прафсаюзнай арганізацый, сакратар камісіі, які назначаецца старшынёй з ліку супрацоўнікаў кафедры.

Графік пасяджэнняў камісій складаецца старшынёй за месяц да пачатку атэстацыі студэнтаў. На адным пасяджэнні камісіі атэстуецца адна акадэмічная група. Атэстацыя праводзіцца ў форме размовы камісіі з кожным студэнтам. Выклікаўшы студэнта, атэстацыйная камісія слухае сакратара камісіі, які абвяшчае змест загадзя запоўненага атэстацыйнага ліста на данага студэнта. Атэстацыйны ліст запаўняецца на агульным сходзе групы ў прысутнасці куратара, членаў бюро ВЛКСМ курса і акадэмічнай камісіі камітэта камсамола і прафбюро факультэта.

Пасля размовы са студэнтам і разгледжання прадстаўленых матэрыялаў камісія прымае рашэнне аб магчымасці яго атэстацыі. Камісія можа не атэставаць студэнта (дрэнна паспяваючага), калі ён ва ўстаноўлены дэканам тэрмін не ліквідаваў акадэмічную запазычанасць, і хадатайнічаць перад дэканатам аб мерах дысцыплінарнага ўздзеяння ў адносінах да неатэставаных студэнтаў.

Вынікі атэстацыі абмяркоўваюцца на сходах вучэбных груп, пасяджэннях кафедр, камітэта камсамола і прафбюро факультэта. Атэстацыйныя лісты з вывадамі захоўваюцца ў асабістай справе студэнта, а вывады ўлічваюцца пры размеркаванні інтэрнатаў, назначэнні стыпендыі, размеркаванні на работу і г. д.

Увядзенне атэстацыі студэнтаў ва універсітэце з'явіцца вялікай падмогай у падрыхтоўцы высокакваліфікаваных, ідэйна загартаваных спецыялістаў.

**А. ЖУК,**
**старшы інспектар вучэбнага аддзела універсітэта.**

# Паведамляе карпункт прафкома

● З мэтай азнаямлення з гістарычнымі помнікамі і месцамі баёў у гады Вялікай Айчыннай вайны прафком універсітэта арганізаваў для студэнтаў паездкі ў Брэсцкую крэпасць-герой. Там пабывае звыш тысячы юнакоў і дзяўчат. Больш 300 студэнтаў ужо наведалі крэпасць. Такія ж паездкі арганізуюцца ў Хатынь і на Курган Славы.

● Хто хоць раз пачуў беларускія ці рускія песні ў выкананні народнай харавой капелы нашага універсітэта, назаўсёды запомніць іх непаўторнасць і меладычнасць. Дзесяткі розных узнагарод мае капела. Нядаўна нашы харысты пабывалі ў Каўнасе, на міжрэспубліканскім студэнцкім свяце песні «Ювентас-72», якое праходзіла там чатыры дні. Кожны нумар праграмы суправаджаўся апладысментамі. Капела заваявала адзін з галоўных прызоў — за выступленне лепшага саліста.

● Зусім нядаўна мы прымалі студэнтаў Калінінградскага універсітэта. Госці наведалі факультэты, пазнаёміліся з універсітэтам, сустракаліся са студэнтамі і выкладчыкамі, а ў заключэнне далі канцэрт мастацкай самадзейнасці. А заўтра 120 студэнтаў і супрацоўнікаў выедуць у Калінінград. На працягу чатырох дзён беларускія юнакі і дзяўчаты будуць знаёміцца з горадам, універсітэтам, выступяць з канцэртамі мастацкай самадзейнасці.

● Як ужо паведамлялася, прафком універсітэта падвёў вынікі агляду-конкурсу на лепшую групу ў гонар 50-годдзя СССР. Выяўлены пераможцы. Групы, што занялі першыя месцы, узнагароджаны паездкай у Ленінград. І вось у мінулую нядзелю студэнты IV курса ФПМ наведалі горад-герой Ленінград, пазнаёміліся з яго памятнымі мясцінамі, прайшлі тымі вуліцамі, што назаўсёды ўвайшлі ў гісторыю. Заўтра ў крэпасць-герой Брэст адпраўляюцца студэнты 3-й групы III курса факультэта журналістыкі і студэнты 9-й групы II курса матфака (яны занялі другія месцы), а студэнты 4-й групы II курса юрфака і 1-й групы IV курса фізфака пабываюць у Хатыні і на Кургане Славы.

**І. СЦЯПУРА.**

# СВЯТА БАНГЛАДЭШ

16 снежня 1971 года ў Паўднёвай Азіі нарадзілася новая незалежная краіна— Народная Рэспубліка Бангладэш. Напярэдадні першай гадавіны ўтварэння рэспублікі мы папрасілі яе прадстаўнікоў — студэнтаў падрыхтоўчага факультэта універсітэта—расказаць аб сабе і сваёй краіне.

— Мы — адны з першых студэнтаў рэспублікі Бангладэш, — гаворыць прэзідэнт зямляцтва Махамед Алі Ашраф, — якія прыехалі сёлета вучыцца ў Савецкі Саюз. З першых дзён мы акружаны вялікай увагай і клопатамі. Шчыра дзякуем за гэта. Нашай краіне, як ніколі раней, зараз патрэбны кваліфікаваныя спецыялісты. І мы ўдзячны савецкім людзям за вялікую дапамогу.

— Год таму назад, — уступае ў размову студэнт Ахмед Ліакат Алі, — у нас была вайна. Адступаючыя войскі Пакістана разбурылі многа гарадоў, вялікіх дарог, аэрадромаў, мастоў, партоў, дамоў. Цяпер трэба ўзводзіць усё занава. А для гэтага патрэбны вялікія веды. Вось і рашылі многія з нас паехаць вучыцца ў Савецкі Саюз, каб стаць высокакваліфікаванымі інжынерамі, а потым у сябе на радзіме будаваць новае, шчаслівае жыццё.

— Мы вельмі рады, што наша свята супала з вашым слаўным 50-годдзем утварэння СССР. Раней мы многа чулі аб Краіне Саветаў.— уступае ў размову яшчэ адзін студэнт рэспублікі Бангладэш Ашраф Удзін Ахмед. — Чулі і ведалі мы пра Беларусь. У сябе на радзіме мы бачылі яе магутныя БелАЗы і трактары.

Карыстаючыся выпадкам, нам хацелася б павіншаваць усіх савецкіх людзей з вялікім святам і пажадаць выдатных поспехаў у будаўніцтве камунізму.

**В. КАЛАДЗІНСКІ.**

# СЕМІНАР ЗЯМЛЯЦТВАЎ

**Адбыўся семінар актыву зямляцтваў замежных студэнтаў, што вучацца ў вну Мінска, прысвечаны 50-годдзю ўтварэння СССР. Перад намі выступілі доктар гістарычных навук Ц. Саладкоў, доктар гістарычных навук А. Хацкевіч, кандыдат гістарычных навук Я. Квачоў.**

**Удзельнікі семінара гутарылі з першым сакратаром ГК ЛКСМБ В. Каўпаковым, старшынёй Камітэта маладзёжных арганізацый БССР В. Ягоравым, сустрэліся з удзельнікамі Вялікай Айчыннай вайны.**

**На семінары мы маглі не толькі абмяняцца думкамі, але і сустрэцца на спартыўнай пляцоўцы, цікава адпачыць.**

**Ад імя замежных студэнтаў я выказваю шчырую ўдзячнасць арганізатарам гэтага цікавага і карыснага мерапрыемства.**

**С. ШАХІН,**
**старшыня савета дружбы універсітэта.**

# ГАРЫЗОНТЫ СЯБРОЎСКІХ СУСТРЭЧ

З раніцы выпаў снег. Тратуары, плошчы, праспекты сталіцы — ва ўрачыстай узрушанасці. Перад галоўным корпусам універсітэта выстраілася калона юнакоў і дзяўчат з чырвонымі стужкамі цераз плячо. На іх словы — «50 год СССР».

Гэта студэнты універсітэта, удзельнікі аўтапрабегу, прысвечанага 50-годдзю Саюза Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік.

Спачатку былі сустрэчы на роднай беларускай зямлі. Нас віталі рабочыя і калгаснікі, студэнты і школьнікі Віцебскай вобласці. Як правіла, кожная сустрэча суправаджалася чытаннем лекцый, душэўнасцю знаёмстваў, выступленнямі «Пілігрымаў», вакальна-інструментальнага ансамбля геафака. У гэтым і мэта аўтапрабегу —змястоўна, з разлікам на аўдыторыю несці ў масы гістарычны сэнс ленінскай нацыянальнай палітыкі, вершам і песняй славіць сённяшні дзень Краіны Саветаў, яе гераічнае мінулае.

...Наш аўтобус, расквечаны транспарантамі, зрабіўшы круг па заснежанай плошчы, спыніўся ля будынка Лепельскага райкома партыі.

А праз якую гадзіну мы зноў у дарозе, трымаем шлях у калгас імя Чапаева, да хлебаробаў вёскі Вялікая Ажэзліна.

Клуб у вёсцы — брыгадны. Пажылы калгаснік, трымаючы ў вузлаватых руках шапку, растлумачыў:

— Клуб у нас свой. Праўда, не філармонія пакуль. А ў Лядна — цэнтры калгаса — клуб ого-о, нават дужа ладны. Будзеце — пабачыце.

За аўдыторыяй затрымкі няма. Прысутных — поўны клуб. Прадстаўнік райкома партыі дае слова выкладчыку універсітэта, кандыдату гістарычных навук Льву Антонавічу Міхайлоўскаму. Ён даступна, на яскравых жыццёвых прыкладах даводзіць да кожнага слухача ленінскую палітыку ўтварэння СССР.

...Добрай раніцы, старажытны Полацк, добрай раніцы, малады квітнеючы горад!

У гэты дзень нашы лектары сустрэліся з работнікамі анкалагічнай бальніцы, навучэнцамі лесатэхнікума, з жыхарамі рабочага інтэрната. Калектыў мастацкай самадзейнасці віталі ў медыцынскім вучылішчы і політэхнічным тэхнікуме.

...Хоць яшчэ зусім раніца і паверхі ўскраінных гмахаў Наваполацка яшчэ толькі-толькі ўспыхнулі святлом, у салоне нашага аўтобуса пачаўся рабочы дзень. Лектарская група ўдакладняе тэмы лекцый, а «Пілігрымы» «спрабуюць галасы». Нас чакаюць у Верхнядзвінску.

Сярэдняя школа № 2. Аўдыторыя маладая, бадзёрая, дапытлівая. Для многіх з іх Беларускі дзяржаўны універсітэт — сённяшняя мара, а заўтра — родны дом. Расказваючы пра сённяшні дзень універсітэта, яго багатую біяграфію, мы стараліся як мага паўней і цікавей пазнаёміць вучняў з

*(Заканчэнне на 4-й стар.)*





*НА ЗДЫМКАХ: у дарозе; лектар паходу, аспірант кафедры гісторыі КПСС А. Тозік расказвае старшакласнікам школы № 1 г. Полацка аб жыцці універсітэцкай моладзі.*

Фота **В. Жука.**

СССР 50

**СЁННЯ АБ СПРАВАХ СТУДЭНТАЎ, ВЫКЛАДЧЫКАЎ І СУПРАЦОЎНІКАЎ АДЭСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ І. І. МЕЧНІКАВА РАСКАЗВАЕ ІХ ГАЗЕТА**

За наукові кадри

Орган парткому, ректорату, комітету ЛКСМУ та профкому Одеського ордена Трудового Червоного Прапора державного університету ім. І. І. Мечникова

# АДЭСКІ АРДЭНАНОСНЫ

НАПЯРЭДАДНІ слаўнага юбілею ў жыцці нашай краіны — 50-годдзя ўтварэння СССР —мы з асаблівым гонарам гаворым аб росквіце навукі і культуры ў нашай краіне. Яскравы прыклад таму — гісторыя Адэскага ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга дзяржаўнага універсітэта імя І. І. Мечнікава, які 13 мая гэтага года адзначыў сваё 107-годдзе. У гэты дзень па традыцыі ва універсітэце праходзяць мечнікаўскія чытанні — своеасаблівы агляд дасягненняў. І тады ўспамінаюцца старонкі гісторыі, багатыя рэвалюцыйныя і навуковыя традыцыі старэйшай на поўдні Украіны вну.

13 мая 1865 года ўпершыню адкрыліся дзверы Адэскага (Новарасійскага) універсітэта. Гэтай падзеі папярэднічала вялікая падрыхтоўчая работа, якую вяло прагрэсіўнае грамадства. Яно дабілася адкрыцця ў Адэсе універсітэта на базе Рышэльеўскага ліцэя. Самы дзейны ўдзел у арганізацыі вну прымаў выдатны хірург і грамадскі дзеяч М. І. Пірагоў.

Новарасійскі універсітэт пачаў сваю дзейнасць, маючы ў саставе тры факультэты: гісторыка-філалагічны, юрыдычны і фізіка-матэматычны. Пачалі вучобу 175 студэнтаў.

Самыя светлыя старонкі гісторыі універсітэта звязаны з дзейнасцю тут вучонага, чыё імя носіць вну, — І. І. Мечнікава, які пачаў працаваць у 1867 годзе. Яго дзейнасць у сценах універсітэта прадаўжалася аж да 1882 года (з невялікім перапынкам). Менавіта ў гэты перыяд вялікі рускі вучоны зрабіў адкрыцці сусветнага значэння.

Разам з Мечнікавым працавалі тут такія выдатныя вучоныя, як І. М. Сечэнаў і А. А. Кавалеўскі. Вялікую навуковую і педагагічную работу вялі хімік Н. Д. Зялінскі, псіхолаг М. М. Ланге і іншыя выдомыя вучоныя.

Адэскі універсітэт багаты і рэвалюцыйнымі традыцыямі. На розных этапах вызваленчага руху тут дзейнічалі рэвалюцыйныя гурткі. З універсітэтам звязана дзейнасць Андрэя Жалябава. Тут працаваў першы на Украіне прафесар-камуніст Е. Н. Шчэпкін — першы савецкі рэктар АДУ.

За гады Савецкай улады універсітэт паступова развіваўся, дзякуючы паўсядзённым клопатам Камуністычнай партыі і Савецкага ўрада. З невялікай навучальнай установы, у якой маглі вучыцца, перш за ўсё, прадстаўнікі ўлады маёмасных, ёнператварыўся ў сапраўды масавы, сапраўды народны універсітэт, у якім вучацца не сотні, а тысячы маладых людзей — дзеці працоўнага народа, дзе разам з юнакамі атрымліваюць адукацыю і дзяўчаты.

Тысячы спецыялістаў даў краіне за час свайго існавання універсітэт. Яны працавалі і працуюць у розных галінах народнай гаспадаркі.

Выпускнікі універсітэта і студэнты 1941-га, як і ўвесь савецкі народ, прайшлі праз суровыя выпрабаванні агнём у гады Вялікай Айчыннай вайны. І ў час геraічнай абароны горада ў жніўні—кастрычніку 1941 года, і на ўсіх франтах яны крывёй сваёй даказалі адданасць Савецкай Айчыне, сацыялістычнаму ладу, партыі. Многія з іх не вярнуліся на родныя факультэты...

Універсітэт стаў адным з вядучых цэнтраў развіцця украінскай культуры — нацыянальнай па форме і сацыялістычнай па зместу. Яго поспехі — састаўная частка поспехаў украінскай савецкай навукі, нагляднае сведчанне тых багатых творчых магчымасцей, якія адкрыліся перад украінскім народам у гады Савецкай улады.

За заслугі ў падрыхтоўцы высокакваліфікаваных спецыялістаў і ў навуковай рабоце Адэскі універсітэт у сувязі са стагоддзем з дня ўтварэння ўзнагароджан у 1965 годзе ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга.

Цяпер у вядучай Адэскай вну дзевяць факультэтаў. Вучэбную і вялікую навуковую работу выконваюць 65 кафедр, на якіх працуе 622 выкладчыкі. У іх ліку — 4 члены-карэспандэнты АН УССР, 50 прафесараў і дактароў навук, 296 дацэнтаў і кандыдатаў навук.

Агульная колькасць студэнтаў перавышае 11 тысяч чалавек.

Ва універсітэце атрымліваюць адукацыю студэнты розных нацыянальнасцей — рускія, украінцы, беларусы, грузіны, малдаване і іншыя. На розных факультэтах вучацца прадстаўнікі 19 замежных краін. Універсітэт падтрымлівае цесныя сяброўскія сувязі з многімі замежнымі універсітэтамі. У мінулым годзе заключан дагавор аб дружбе і супрацоўніцтве паміж Адэскім і Сегедскім (Венгрыя) універсітэтамі. Брацкія вну абменьваюцца навуковымі, студэнцкімі маладзёжнымі дэлегацыямі, будаўнічымі атрадамі. У красавіку ў Адэскім універсітэце гасціла вялікая група прадстаўнікоў мастацкай самадзейнасці Сегедскага універсітэта.

На кафедрах і ў навуковых установах вядзецца вялікая навуковая работа. Важныя даследаванні праводзяцца на кафедры арганічнай хіміі, у інстытуце фізікі, абсерваторыі і яе філіяле, праблемных лабараторыях і іншых. Агульны эканамічны эфект навуковых даследаванняў перавышае 3 рублі на рубель затрат. Вучоныя ўзялі абавязацельствы дабіцца эканамічнага эфекту ў 3,5 рубля на рубель затрат. Яно паспяхова выконваецца.

Універсітэт паступова расце, развіваецца. У апошнія гады пабудаваны два студэнцкія інтэрнаты, будуецца корпус гуманітарных навук, у бліжэйшыя гады намечана будаўніцтва яшчэ двух інтэрнатаў.

З кожным годам удасканальваецца вучэбны працэс, паляпшаюцца ўмовы для навуковай работы, ствараюцца новыя кабінеты, актыўна ўдасканальваюцца метады праграміраванага навучання. Ва універсітэце сканструяваны навучаючыя машыны і цэлыя комплексы, класы, якія атрымалі высокую ацэнку на ВДНГ СССР.

Шматтысячны калектыў універсітэта, натхнёны гістарычнымі рашэннямі XXIV з'езда КПСС, удасканальвае падрыхтоўку высокакваліфікаваных спецыялістаў, здольных рашаць самыя складаныя задачы нашага часу, быць у авангардзе навуковага, тэхнічнага і культурнага прагрэсу.

**А. В. БАГАЦКІ,**
**член-карэспандэнт АН УССР, прафесар, рэктар Адэскага універсітэта.**

# ІНСТРУМЕНТЫ ДЛЯ СЛУЖБЫ НЕБА

Астраномам усяго свету добра вядома Адэская абсерваторыя, якая ў мінулым годзе адзначыла сваё 100-годдзе, і імя яе кіраўніка, члена-карэспандэнта АН УССР, прафесара В. П. Цэсевіча.

Сучасныя абсерваторыі абсталяваны навейшай тэхнікай, што дазваляе не толькі бачыць зоркі, але і прыслухоўвацца да іх дыхання, назіраць у шматразовым павелічэнні і здымаць на плёнку нават самыя малыя змяненні ў Сусвеце. Прагрэс навукі прад'яўляе ўсё новыя патрабаванні да інструментаў, якімі карыстаюцца астраномы.

На Адэскай абсерваторыі і ў яе філіяле пабудаваны эксперыментальныя майстэрні, дзе энтузіясты — оптык А. Н. Фашчэўскі, інжынеры Л. С. Паўлін і В. Н. Іваноў — пад кіраўніцтвам В. П. Цэсевіча праводзяць работы па вырабу вялікіх сучасных тэлескопаў. Першыя доследы далі выдатныя вынікі. Тэлескопы, зробленыя ў Адэсе, добра зарэкамендавалі сябе ў рабоце, атрымалі выдатныя водгукі вядучых вучоных краіны.

Эксперыментальныя майстэрні не толькі забяспечваюць сябе інструментамі, але і вырабляюць іх па заказу іншых абсерваторый.

Цяпер у майстэрнях вядуцца работы па вырабу чатырох 16-дзюймовых тэлескопаў для Літоўскай, Свярдлоўскай, Саратаўскай, Казанскай абсерваторый.

# ДЫПЛОМ ЗА КНІГУ

На пленуме абласной арганізацыі таварыства «Веды» старшыня таварыства член-карэспандэнт АН УССР, прафесар А. В. Багацкі уручыў прафесару кафедры гісторыі СССР, доктару гістарычных навук С. К. Мельніку заахвочвальны дыплом за кнігу «Дэлегат бальшавікоў Адэсы», якая адзначана на конкурсе на лепшыя творы навукова-папулярнай літаратуры ва Усесаюзным таварыстве «Веды».

# НОВАЯ СПЕЦЫЯЛЬНАСЦЬ

У дэканаце механіка-матэматычнага факультэта ціха. Двое схіліліся над вялікімі аркушамі паперы. Падлічваюць, звяраюць, упісваюць лічбы ў клетачкі. Зноў звяраюць, падлічваюць. Нарэшце, задаволены.

Двое—гэта дацэнт В. О. Плотнікаў, якому прыйдзецца чытаць большасць з новых курсаў, і намеснік дэкана дацэнт Н. Я. Цыханенка. А вялікія аркушы — вучэбныя планы новага аддзялення, якое нядаўна адкрылася на механіка-матэматычным — прыкладной матэматыкі.

Такім чынам, да спецыяльнасцей, якія атрымлівалі студэнты механіка-матэматычнага, цяпер прыбавілася новая—спецыялістаў вылічальнай тэхнікі, здольных праводзіць даследаванні па стварэнню сістэм матэматычнага забеспячэння і прымянення іх у навуцы і гаспадарцы. Гэта вельмі важная для народнай гаспадаркі спецыяльнасць. Без вылічальнай матэматыкі і кібернетыкі, без спецыялістаў, якія валодаюць складаным матэматычным апаратам і могуць прымяняць яго для работы на ЭВМ, немагчымы тэхнічны прагрэс.

У канцы сёлетняга года ў жыццё ўступіць першы атрад выпускнікоў па новай спецыяльнасці ў колькасці 75 чалавек.

У будучым намячаецца стварыць самастойны факультэт.

**На здымках:** экзамен па неарганічнай хіміі здае студэнтка II курса вячэрняга аддзялення хімфака Т. Дулімава; (справа) у адной з лабараторый інстытута фізікі АДУ.
Фота **А. ЛЕВІТА.**





# ХТО БУДЗЕ СТУДЭНТАМ?

Вузаўскім камсамольскім арганізацыям не ўсё роўна, хто прыходзіць на першы курс, хто праз некалькі год атрымае ганаровае і адказнае права выхоўваць людзей, кіраваць вытворчасцю. Значыць, трэба адбіраць і рыхтаваць найбольш здольную і падрыхтаваную моладзь да паступлення ў вну.

У нашым універсітэце створан камсамольскі штаб па набору. Асноўнымі функцыямі яго будуць паездкі студэнцкіх брыгад у падшэфныя раёны вобласці, арганізацыя кансультацый для абітурыентаў, дапамога ў пытаннях быту, падрыхтоўка да экзаменаў і адпачынку будучых студэнтаў, распаўсюджанне аб'яў і праспектаў аб прыёме на прадпрыемствах, у калгасах і саўгасах, арганізацыя сустрэч з моладдзю, лекцый і гутарак аб універсітэце і яго традыцыях. Да работы ў штабе прыцягнуты маладыя выкладчыкі, супрацоўнікі навукова-даследчых лабараторый і студэнты.

**В. КОМАРЧАЎ,**
**намеснік сакратара камітэта ЛКСМУ.**

# ГУРТОК САЦЫЯЛЬНАЙ ПСІХАЛОГІІ

Пры кафедры псіхалогіі на гістарычным факультэце пачаў працаваць навуковы студэнцкі гурток сацыяльнай псіхалогіі.

Нягледзячы на тое, што курс сацыяльнай псіхалогіі як самастойны пакуль што не чытаецца ў нашым універсітэце, гурток выклікаў інтарэс у студэнтаў розных факультэтаў.

Не выклікае сумнення не толькі тэарэтычнае, але і практычнае значэнне сацыяльнай псіхалогіі. Калі маеш справу з калектывам, трэба помніць, што ён не з'яўляецца механічным лікам членаў, а чымсьці большым, таму што сам працэс адносін паміж людзьмі ў групе ўплывае на кожнага яе члена асобна. Такім чынам, працуючы з калектывам, карысна ведаць адносіны, якія склаліся ў ім. На першым арганізацыйным пасяджэнні выступіла аўтар гэтых радкоў з дакладам «Прадмет, метад і задачы сацыяльнай псіхалогіі». На гэтым жа пасяджэнні быў зацверджан план работы, выбраны староста і сакратар гуртка.

На другім пасяджэнні студэнты вячэрняга аддзялення Ярмонава, Аткаленка і Кісава, бібліятэкары па спецыяльнасці і супрацоўнікі мясцовых масавых бібліятэк, выступілі з дакладамі «Інтарэсы чытачоў-рабочых», «Інтарэсы чытачоў - старшакласнікаў» (даныя самастойных даследаванняў). Даклады выклікалі ажыўлены абмен думкамі.

На трэцім пасяджэнні быў заслухан даклад студэнта III курса гістарычнага факультэта вячэрняга аддзялення В. Радчанкі «Кіно і школьнік».

Акрамя ўказаных тэм, на бліжэйшых пасяджэннях гуртка будуць прачытаны даклады «Тэлебачанне і школьнік», «Даследаванне адносін паміж людзьмі ў невялікай сацыяльнай групе», «Школьны клас, студэнцкая група», «Інтарэсы чытачоў студэнтаў» і іншыя. Плануюцца даклады «Псіхалогія і гісторыя», «У. І. Ленін і пытанні сацыяльнай псіхалогіі».

**Л. БЕЛЕНЬКАЯ,**
**дацэнт кафедры псіхалогіі.**



# МАЦНЕЕ ДРУЖБА

Добрай традыцыяй стаў абмен студэнцкімі будаўнічымі атрадамі паміж нашым і Сегедскім універсітэтамі. Летам гэтага года студэнты АДУ дапамаглі будаваць аб'екты ў Сегедзе, а венгерскія сябры працавалі на будаўнічых аб'ектах нашай вну.

Пасля заканчэння работ госці пазнаёміліся са славутасцямі Адэсы, з універсітэтам. Дэлегацыю, якую ўзначальвала журналістка універсітэцкай газеты Эмілія Шаркадзі Надзь, прыняў рэктар універсітэта прафесар А. В. Багацкі. Ён расказаў аб гісторыі адной са старэйшых вну краіны, аб вучэбнай, навуковай і выхаваўчай рабоце. Адбылася цёплая размова паміж студэнтамі універсітэта-пабраціма і кіраўніцтвам нашага універсітэта.

# «АРЫСТОН»

Такую назву далі біёлагі свайму клубу. Некалькі слоў аб яго паходжанні. Старажытныя грэкі называлі арыстонам сярэдзіну паміж двума бакамі якой-небудзь з'явы, якой-небудзь рэчы, тое, што з пункту гледжання матэрыялістычнай дыялектыкі мы можам назваць правільнай лініяй у адзінстве і барацьбе супрацьлегласцей і што інстынктыўна ўспрымаецца намі як прыгажосць. Сінонімам арыстона (прыгажосці) грэкі лічылі пачуццё меры, пачуццё настолькі тонкае, што іншы раз яго вельмі цяжка вызначыць.

Такім чынам, мы назвалі наш клуб «Арыстон» адпаведна задачам, якія ён перад сабою ставіць. Было праведзена некалькі вечароў паэзіі, вечар рускага раманса, вечар замежнай паэзіі і музыкі, вечар абмеркавання актуальных пытанняў, якія хвалююць моладзь свету. У пасяджэннях клуба прымаюць удзел і іншаземныя студэнты.

У нашым студэнцкім кафэ «Арыстон» прысутнічалі рэктар універсітэта А. В. Багацкі, доктар філасофскіх навук, прафесар А. І. Уёмаў, доктар медыцынскіх навук, прафесар Р. І. Файтэльберг, доктар медыцынскіх навук, прафесар А. Я. Разанаў і іншыя. Яны адказвалі на пытанні, вялі размову аб сэнсе жыцця, ідэалах моладзі, мэтах і задачах пакалення, марылі аб будучым.

**Р. ШАТЛОВА,**
**студкор III курса біялагічнага факультэта.**



Палеанталагічны музей Адэскага дзяржаўнага універсітэта—адзін з буйнейшых у Еўропе.

**На здымку:** экспанаты музея.

# ДАРОГА

Звычайна Сібір здзіўляе чалавека з паўднёвых шырот сваім кліматам — суровым, халодным. А ў гэтым годзе яна нас «вітала» незвычайнай гарачынёй, якая, праўда, бывае і ў нас, у Адэсе. Розніца толькі ў тым, што 35 градусаў у Адэсе звычайна змякчаюцца прыемным і ласкавым ветрыкам з мора, а тут стаіш пад гарачым сонцам, не маючы права скінуць мокрую ад поту спецвопратку, таму што тут цябе можа «абласкаць» царыца тайгі — машкара.

«Парус» — так назвалі мы свой атрад—кінуў якар на беразе Обі, у далёкім пасёлку. Адпаведна дагавору, нам прадстаяла пабудаваць «ляжнёўку» — дарогу для аўтамабіляў, якія будуць вывозіць летам лес для ўчасткаў. А лесу тут дастаткова. На кіламетры — векавая тайга, ёсць месцы, дзе не ступала нага чалавека.

Як заўсёды, цяжка пачаць. Але гэты рубеж пераадолелі паспяхова. Рабяты выйшлі пераможцамі не толькі ў барацьбе з цяжкасцямі, але і з самімі сабой.

...Саня Роўны задыхаўся ад жары і стомленасці, але не выпускаў з рук «Дружбы», распілоўваючы лес, неабходны для будаўніцтва дарогі. Віця Навіцкі цягнуў крукам брусы. З іх выкладвалі каляю, па якой ужо вясной пойдуць машыны, што павязуць каштоўны лес.

Віктар працуе з уздымам. Ён палюбіў гэтую дарогу, сяброў. І яго паважаюць у брыгадзе за вясёлы нораў, сумленне, гонар, уменне, хватку. Такіх тайга з машкарой не зломіць.

5 жніўня ўся брыгада радасна сустрэла першы аўтамабіль, які праехаў за намі цэлы кіламетр.

...Тайга неахвотна аддавала людзям кожны метр, і дарога даўжынёй у паўтара кіламетра стала дарогай барацьбы, загартоўкі, дарогай вопыту ў пераадоленні цяжкасцей. І вось настаў дзень, калі работы былі закончаны, дарога пабудавана. Магчыма, тут вырасце новы горад, а пакуль што пракладзен шлях для лесу, які шчодра аддае тайга людзям.

**А. ВІНІЧ.**

# МАЛЬЕР ПА-ФРАНЦУЗСКУ

У жыцці кожнага самадзейнага калектыву наступае час, калі ён імкнецца выйсці за межы сваёй аўдыторыі, прадэманстраваць сваю творчасць шырокаму колу гледачоў. Менавіта такі момант перажывае ў гэтыя дні студэнцкі драматычны калектыў факультэта рамана-германскай філалогіі, першы юбілей якога нашы артысты адзначылі ў маі сёлетняга года.

Калектыў гэты — незвычайны. На сцэне гучыць цудоўная французская мова, мова сусветна вядомых пісьменнікаў. Ідэя стварэння такога аматарскага тэатра здавалася вельмі смелай. Замежная мова на сцэне абавязвае да вялікай адказнасці, да таго ж яшчэ патрэбен талент. Але знайшліся смельчакі, якія прынялі гэтыя дзве ўмовы. Каго іграць? На чым затрымаць свой выбар? Французская драматургія такая featureразнабаковая, што цяжка аддаць чаму-небудзь перавагу. У выніку дыскусій выбралі творы А. Франса «Нямая жонка», М. Паньёля «Тапаз», Ж. Іанескі «Ліса-спявачка», Ж. Курцелін «Гадзіннік». Кіраўнікі тэатра, выкладчыкі кафедры французскай філалогіі О. Л. Ханенка і Г. І. Млінчык адобрылі рэпертуар. І тэатр пачаў працаваць. Рэпетыцыі ішлі за рэпетыцыямі. Старанная шліфоўка мовы і пластыкі патрабавала немалых намаганняў.

Непрыкметна прыйшоў дзень прэм'еры. Апладысменты гледачоў прагучалі як адабрэнне, як прызнанне працы артыстаў-аматараў.

Наступныя спектаклі праходзілі з нязменным поспехам. Хутка калектыў быў вымушан адхіліцца ад праграмы і паставіць п'есу на рускай мове. Але і тады ён заставаўся верным французскай тэматыцы. На гэты раз у рэпертуар увайшоў твор савецкага драматурга М. Булгакава «Прыдуркаваты Журдэн». Спектакль прайшоў з вялікім поспехам. Дынамізм п'есы адкрыў новыя магчымасці перад тэатрам.

А наперадзе было новае складанае заданне ў сувязі са знамянальным юбілеем вялікага французскага камедыёграфа Жана Баціста Мальера. Творчасць гэтага тэатральнага рэфарматара вельмі папулярная сярод студэнтаў факультэта. Тут яго вывучаюць, ведаюць і добра разумеюць. П'есы Мальера вызначаюцца глыбокім псіхалагічным аналізам, таму іх пастаноўка даецца нялёгка.

Ясна ўсведамляючы складанасць задання, калектыў прыступіў да работы. Кожны старанна вывучаў спадчыну Мальера, сцэнічныя прыёмы мальераўскага тэатра, складаную мову XVII стагоддзя. Вынікі першых рэпетыцый былі не вельмі суцяшальныя. Але калектыў нястомна прадаўжаў пошукі патрэбных інтанацый, рухаў, мімікі. Паступова Тарцюф (Г. Гураль) ператварыўся ў сапраўднага святошу, Журдэн (М. Лях) — у хітрага буржуа, які пакутуе маніяй добразычлівасці, філосаф Панкрас (І. Банееў) — у махляра, які цягне грошы з кішэні падманутага Журдэна, Мадлен і Като (Т. Бараноўская, Е. Левандоўская) — у смешных манерніц, Маскарыль (О. Малыхін) — у хітрамудрага плебея.

Прадстаўленне адбылося напярэдадні 350-годдзя з дня нараджэння Ж. Б. Мальера. Самадзейны калектыў аддаў належнае славе вялікага драматурга.

Калектыў, як і раней, з уздымам працуе над расшырэннем свайго рэпертуару. Наперадзе — новыя пошукі, праца, звязаная з рэалізацыяй даўніх планаў, аб якіх трупа пакуль што не асмельваецца гаварыць уголас. Але можна сказаць некалькімі словамі: стварыць тэатр класічнай паэзіі, вывесці на сцэну Карнеля, Расіна з іх неўміручымі ісцінамі аб любві, вернасці, доўгу.

**І. БАНЕЕЎ,**
**М. ЛЯХ.**



**На здымку:** сцэна са спектакля «Тапаз» М. Паньёля.

## У некалькі радкоў

30-годдзю перамогі Савецкай Арміі пад Сталінградам была прысвечана канферэнцыя чытачоў, якую арганізавалі і правялі работнікі універсітэцкай бібліятэкі і выкладчыкі ваеннай кафедры універсітэта.

На канферэнцыі выступілі студэнты факультэта журналістыкі і філалагічнага факультэта В. Дарохін, А. Куліцкі, А. Цікоцкі і іншыя. Яны расказалі аб значэнні сталінградскіх падзей.

З цікавасцю было выслухана выступленне ўдзельніка вялікай бітвы на Волзе Героя Савецкага Саюза генерал-маёра ў адстаўцы А. В. Кірсанава. **В. РЫБІЦКІ.**

* * *

У актавай зале універсітэта адбылася палітінфармацыя на тэму «Аб асноўных напрамках сучаснай эстэтыкі».

Лекцыю прачытаў дацэнт кафедры гісторыі і логікі М. І. Крукоўскі. Ён расказаў студэнтам аб барацьбе матэрыялістычных і ідэалістычных тэндэнцый на сёлетнім Бухарэсцкім міжнародным кангрэсе, дзе прадстаўляў эстэтычную думку нашай рэспублікі.

**У. ЯРОШЫК.**

# ГАРЫЗОНТЫ СЯБРОЎСКІХ СУСТРЭЧ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

жыццём кожнага факультэта.

Пасля канцэрта нас чакала знаёмства са школьным краязнаўчым музеем, які лічыцца адным з лепшых у рэспубліцы. У кнізе наведвальнікаў мы пакінулі шчырыя запісы свайго захаплення, падарылі музею памятны фотаальбом аб універсітэце.

...І зноў дарога. Вячэрнімі агнямі прамільгнула ў сінім сутонні Краслава — першы латвійскі горад. Потым быў Даўгаўпілс. Цёпла, па-сяброўску сустрэлі нас студэнты Даўгаўпілскага педагагічнага інстытута.

Нацыянальны састаў Даўгаўпілскага педінстытута — адзін з яскравых прыкладаў ленінскай нацыянальнай палітыкі. На ўсіх факультэтах інстытута займаюцца студэнты 14 нацыянальнасцей, у тым ліку каля 260 юнакоў і дзяўчат з Беларусі.

Але не толькі ім, беларусам, былі блізкімі і зразумелымі народныя песні, што прагучалі тут у выкананні «Пілігрымаў».

Калі меркаваць па апладысментах, беларускія народныя песні «Ці свет, ці світае», «Бацька добры», «Ноч на Івана Купалу» і інш. былі прыняты аўдыторыяй з захапленнем. На развітанне студэнты дзвюх навучальных устаноў краіны абмяняліся памятнымі альбомамі. А яшчэ гучала песня. Вось гэта:

Бывайце здаровы,
Жывіце багата,
А мы ўжо паедзем
Дадому, дахаты...

Але не, не дадому збіраліся мы ў той памятны вечар. На наступны дзень мы былі гасцямі ў літоўскіх студэнтаў. Далёка за поўнач зацягнулася сустрэча ў гасцінай Вільнюскага педінстытута. Мы расказвалі пра сябе, слухалі гаспадароў, пілі каву, прыгатаваную студэнтамі. Мы былі прыемна здзіўлены, калі пачулі, што кожны выпускнік інстытута мае залік па такому прадмету, як культура быту.

А калі халоднае асенняе сонца толькі-толькі паднялося над старою башняю Гедэмінаса, мы разам з Раманам Мечкоўскім, студэнтам факультэта польскай мовы і літаратуры, нашым гідам, любаваліся старым Вільнюсам.

**В. ДРАНЧУК,**
**удзельнік агітпрабегу.**

*НА ЗДЫМКАХ: лектар кандыдат гістарычных навук Л. А. МІХАЙЛОЎСКІ прымае памятны сувенір ад удзячных слухачоў.*

*Фота В. ЖУКА.*





## ПРЫСВЕЧАНЫЯ ЮБІЛЯРАМ

Адбылося расшыранае пасяджэнне кафедр марксісцка-ленінскай філасофіі, гісторыі філасофіі і логікі, зарубежнай літаратуры, прысвечанае 250-годдзю з дня нараджэння Г. С. Скаварады і 175-годдзю з дня нараджэння Г. Гейне. З дакладамі аб юбілярах выступілі член-карэспандэнт АН БССР прафесар І. М. Лушчыцкі, кандыдат філасофскіх навук В. Ф. Шалькевіч, кандыдат філалагічных навук Н. І. Лапідус і ст. выкладчык Н. Г. Галенка.

* * *

Другакурснікі беларускага аддзялення філфака і старшакласнікі 4-й сярэдняй школы імя С. М. Кірава правялі вечар, прысвечаны 175-годдзю з дня нараджэння Генрыха Гейне.

Аб жыцці і творчасці вялікага нямецкага паэта расказаў дацэнт кафедры зарубежнай літаратуры Н. І. Лапідус. Затым прагучалі вершы.

Прадстаўнік з ГДР, студэнт II курса фізфака Арвед Шылер прачытаў вершы Г. Гейне на нямецкай мове, расказаў аб ушанаванні памяці паэта на яго радзіме.

Камсорг курса У. Ламека падарыў гасцям кнігу «Універсітэт паэтычны».

**Г. КУПРЭВІЧ.**

# ЗАПРАШАЕМ!

На гістфаку было свята. Факультэцкая сям'я ўрачыста прымала новых членаў. З благаславення ўсемагутнай Кліа — каралевы гісторыі (студэнтка III курса Т. Баляснікава) расчыніліся перад першакурснікамі вароты каралеўства. Імянінікам урачыста ўручылі «Кнігу ведаў», а яны ўзамен прынеслі на алтар гісторыі свае сэрцы і ўрачыстую клятву: «Свет, у які мы ўступаем, стане нашым светам, а веды, якія мы атрымаем, аддадзім людзям, і не будзе з гэтай пары для нас імя больш святога, чым гісторык. Клянёмся ў гэтым».

Са знамянальным днём пасвячэння ў студэнты першакурснікаў цёпла павіншаваў дэкан факультэта дацэнт П. З. Савачкін.

Студэнцкую эстафету перадалі віноўнікам урачыстасці выпускнікі.

Па традыцыі цырыманіял пасвячэння закрыўся прадстаўленнем факультэцкага тэатра мініяцюр.

**Л. ФІНКЕЛЬШТЭЙН,**
**студэнтка V курса аддзялення гісторыі.**

# СТУДЭНТЫ— ВУЧНЯМ

Студэнты гістарычнага факультэта сябруюць з вучнямі 19-й спецыялізаванай школы з гуманітарным ухілам. У школе працуе гістарычны гурток, якому студэнты падарылі кнігі, вучэбныя дапаможнікі. Летам на археалагічнай практыцы разам са студэнтамі II курса былі і дзевяцікласнікі школы... Члены лектарскай групы, якой кіруе кандыдат гістарычных навук дацэнт І. О. Царук, выступаюць перад школьнікамі з лекцыямі і дакладамі.

9 снежня ў школе адбылася канферэнцыя, прысвечаная 50-годдзю ўтварэння СССР. Перад вучнямі выступілі першакурснікі Блажкоў, Мікульчык, Іванова, Марцылева, Янбулатава.

Па просьбе вучняў у бліжэйшы час будуць прачытаны лекцыі па нацыянальнаму пытанню і аб Вялікай Айчыннай вайне.

**Т. СІДАРАВА,**
**А. ЦЫГАНКОВА.**

# ВЕСТКІ З ГІСТФАКА

# ДЗЯКУЙ, УНІВЕРСІТЭТ!

Апошні званок... У школьных класах і калідорах ён будзе яшчэ не раз звінець для іх, але ў аўдыторыях універсітэта ён прагучаў у апошні раз.

Словы дэкана факультэта П. З. Савачкіна нікога не пакінулі раўнадушным. Ён сказаў, што праляцелі гады вучобы, былі поспехі і няўдачы, радасці і расчараванні. Але галоўная задача выканана — яны стануць сапраўднымі спецыялістамі і пранясуць прагу да ведаў праз усё жыццё, шмат дзіцячых сэрцаў запаляць імкненнем пазнаць ісціну. З верай у гатоўнасць студэнтаў да экзаменаў прагучалі заключныя словы: «Спадзяюся, што троек не будзе. Так?»

— Так!

На сцэне—зводны хор пяцікурснікаў імя дэканата гістфака . Ён спявае. І ўсе пераконваюцца, што гісторык — не качагар і нават не цясляр, — проста гісторык і археолаг, для якога няма перашкод. Гэта ж было паказана ў дыяпазітывах аб студэнцкай практыцы, аб кубаметрах выкапанай зямлі і знаходках, аб зморaных, але не сумных тварах рабят.

«Характэрныя» эпізоды са студэнцкага жыцця. Дастойныя пытанні выкладчыка — знаходлівыя адказы студэнтаў на практычных занятках.

— Якая гаспадарка была ў Рабінзона Крузо?

— У Крузо была добранькая, маленькая... натуральненькая гаспадарка, якая з натуральнай, па прычыне паяўлення ў яго жонкі і ўсіх вынікаючых адсюль акалічнасцей і расходаў, пераратварылася ў таварна-грашовую...

Выкладчык уражан, астатнія таксама. На экзаменах прадаўжаецца гульня ў пытанні і адказы.

Але вучоба студэнтаў — гэта не толькі «гульня ў вясёлых і знаходлівых» з дацэнтамі, экзаменатарамі, гэта практыка, якая прыносіць радасць вучням і карысць студэнтам!

Вядучыя вечара — пяцікурснікі Л. Фінкельштэйн і В. Арлоў—паведамляюць, што студэнт— паняцце шматграннае. І мы пераконваемся ў гэтым, калі паяўляецца аддзяленне курсантаў-гісторыкаў, якія, зразумела, не забылі баявых традыцый прапрадзедаў: гучыць старая салдацкая песня «Салавей, салавей, пташачка...» Але курсанты ўмеюць не толькі добра спяваць, яны праяўляюць тактычную сталасць на занятках па агнявой падрыхтоўцы. Курсант В. Арлоў на агнявым рубяжы чакае прыбліжэння (і правільна робіць!) нерухомых грудных мішэняў, каб абавязкова расстраляць «праціўніка»!

Дзяўчаты ў белых халатах... яны гатовы прыйсці на дапамогу ўпаўшаму ў непрытомнасць студэнту на экзаменах. Медсёстры... яны гатовы, калі трэба будзе, «налажыць белы бінт, болю бант», як пісаў паэт А. Русецкі.

Гучаць карысныя парады:

— Не пішы вялікіх дыпломных прац: дыпломная — не раман «Вайна і мір» і ты не Леў Талстой.

— Кароткасць — або вялікі талент, або беднасць розуму. Ні таго, ні другога экзаменацыйная камісія табе не дару е.

Не менш цікавыя парады маладому спецыялісту, які зможа з першай палучкі пакінуць суму, роўную стыпендыі, а на апошнюю смела «адзначыць»... што? — сваё першае школьнае свята. Выпускніку, каб пазбегнуць павелічэння смехамінут на ўроку, трэба забыць шкодныя студэнцкія прывычкі: знаходзіць вобмацкам старонку з патрэбнай датай, хаваць канспекты ў настаўніцкі стол...

Затым падзяка выкладчыкам, якую выпускнікі захаваюць у сваіх сэрцах. Кветкі... і песня:

За то, что любим мы историю,
Спасибо, университет!

Урачыстая перадача званка першакурснікам— перадача эстафеты любві да гісторыі.

**Л. ЛЕВІТ,**
**студэнт.**

## Спорт

⊙ *У спартыўнай зале універсітэта адбыўся баскетбольны турнір. У спаборніцтвах, акрамя гаспадароў, выступілі каманды Латвійскага і Вільнюскага універсітэтаў.*

*У напружанай барацьбе першае месца заняла каманда нашага універсітэта, якая выйграла ў баскетбалістаў ЛДУ з лікам 95:87 і ВДУ — 78:64.*

*Т. ЗАСІМ.*

⊙ *Кожны аматар спорту добра ведае Мікалая Озерава і Навума Дымарскага. Іх галасы мы часта чуем з самых розных краін і кантынентаў, адкуль яны вядуць спартыўныя рэпартажы.*

*І вось нядаўна заслужаны артыст РСФСР, заслужаны майстар спорту Мікалай Озераў і яго калега Навум Дымарскі былі гасцямі студэнтаў і выкладчыкаў нашага універсітэта. Яны расказалі аб тым, як сталі спартыўнымі каментатарамі, аб асаблівасцях сваёй работы, адказалі на многія пытанні.*

*І. СЦЯПАНАЎ.*

⊙ *Праходзіць чарговы этап універсітэцкай спартакіяды — першынство па валейболу.*

*Адбылася сустрэча паміж жаночымі камандамі матэматыкаў і гісторыкаў. Яе лік 2:0 на карысць матэматыкаў.*

*Цікавай была гульня мужчынскіх каманд ФПМ і юрфака. Лік ішоў ачко ў ачко. Некалькі разоў падаваўся кантрольны мяч. Але перамога ўсё ж засталася на баку ФПМ — 2:1. Дзяўчаты юрфака перамаглі дзяўчат з факультэта журналістыкі з лікам 2:0. Такі вынік сустрэчы паміж жаночымі зборнымі біяфака і матфака.*

*Гульні па валейболу працягваюцца.*

*В. САНДЫРАВА,*
*Г. ШПАКОЎСКАЯ.*

⊙ *Чацвёртакурснікі фізфака працягваюць здаваць нарматывы спартыўнага комплексу ГПА. Праведзены спаборніцтвы па стральбе. Трэба адзначыць поспех студэнтаў адзінаццатай групы. Усе яны здалі нормы, а Галіна Гарманенка Міхаіл Кулак, Васіль Захаранка, Генадзь Якутовіч, Уладзімір Буйленкаў і Леанід Казакевіч — на залаты значок.*

*Наперадзе ў фізікаў спаборніцтвы па лыжнаму спорту і плаванню.*

*І. ЛАЎРЫНАВІЧУС.*

В. а. рэдактара С. В. ГОВІН.

Наш адрас: г. Мінск, універсітэцкі гарадок, галоўны корпус, п. 106. Тэлефон — 22-07-19.
Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КП Беларусі.
АТ 21065
Тыраж 2.000 экз. Заказ 1514.